УДК 069.01

# ГРОДЗЕНСКАЕ ПРАВАСЛАЎНАЕ ДУХАВЕНСТВА НА ФАТАГРАФІЯХ (СА ЗБОРАЎ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА МУЗЕЯ ГІСТОРЫІ РЭЛІГІІ)

***А. У. Ціхаміраў***
*магістр культуралогіі, загадчык аддзела*
*навукова-даследчай і экспазіцыйна-выставачнай работы*
*Беларусь, Гродна, Гродзенскі дзяржаўны музей*
*гісторыі рэлігіі*

*Артыкул прысвечаны фотаграфіям праваслаўных святароў г. Гродна другой паловы XIX ст. – пачатку XX ст., якія знаходзяцца ў сховішчах Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі. Робіцца выснова, што фотаграфіі з'яўляюцца цікавай крыніцай па гісторыі праваслаўя і патрабуюць далейшага шматбаковага і дакладнага даследвання.*

*Ключавыя словы: фотаграфія; фотаздымак; музееведение, православие, Гродно.*

Візуальныя крыніцы ў апошнія дзесяцігоддзі выклікаюць значную цікавасць даследчыкаў пры вывучэнні розных гістарычных перыядаў. Выкарыстанне фатаграфій не проста робіць канкрэтнае даследванне прывабным і цікавым, але і дапамагае ўдакладніць дэталі, дазваляе ўявіць часткова або поўнасцю той ці іншы аб'ект, ці наблізіць да сучасніка постаць з мінулага. Фатаграфіі з'яўляюцца наяўнымі сведчаннямі пра розныя падзеі, з дапамогай якіх сучасны чалавек нібыта вяртаецца ў мінулае і можа пабачыць тое, што здарылася шмат год таму. Пры гэтым фотаздымак уласна – гэта і захаванае на негатыве, шкле ці паперы "бачанне" аб'екта фатографам, які яго выканаў.

Для мінулага рэлігійных канфесій фатаграфіі вельмі часта бываюць адзінымі даступнымі зараз крыніцамі, асабліва ў выпадках, калі недастаткова пісьмовых ці вусных сведчанняў. Гэтае сцвярджэнне таксама тычыцца і гісторыі Праваслаўнай царквы ў Беларусі ў XIX – XX стст.

Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі (ГДМГР) на сённяшні час з'яўляецца адзінай спецыялізаванай дзяржаўнай музейнай установай Беларусі, дзе збіраюцца і захоўваюцца прадметы аб дзейнасці ўсіх рэлігійных канфесій у краіне ад старажытных часоў да сучаснасці. Свае зборы музей дэманструе на пастаяннай і часовых экспазіцыях, праводзіць навукова-даследчую работу і дае магчымасць наведвальнікам дакрануцца да багатай шматкультурнай спадчыны.

Калекцыя фатаграфій пачала складвацца з самага пачатку дзейнасці музея. Першы фотаздымак паступіў у фонды ў 1977 г. У тым жа годзе музей быў пераведзены з Полацка ў Гродна. З гэтага часу зборы толькі павялічваюцца. Калекцыя ўключае ў сябе ўнікальныя фатаграфіі паловы XIX – пачатку XX ст. Гэта партрэты духавенства розных канфесій, групавыя фатаграфіі, на якіх прадстаўлены выдатныя дзеячы рэлігіі і культуры, помнікі архітэктуры. Аснову калекцыі складаюць бытавыя фатаграфіі XIX – пачатку XX ст. з выявамі людзей розных саслоўяў, якія даюць магчымасць прасачыць эвалюцыю адзення, абутку і прычосак; з выявамі старажытнасцей; абрадавых дзеянняў: вяселля, Калядаў, Вялікадня, Дзядоў і інш. Вялікую частку складаюць таксама фатаграфіі XX ст.,

якія адлюстроўваюць новыя савецкія традыцыі: вяселлі, імянарачэнні, грамадзянскія, сельскагаспадарчыя і каляндарныя святы.

У дадзеным артыкуле звяртаецца ўвага толькі на пяць фатаграфій з фондаў музея. На іх – вядомыя прадстаўнікі гродзенскага праваслаўнага духавенства 1930–1940-х гадоў, якія значна паўплывалі на рэлігійнае жыццё горада і рэгіёна.

Здымак, выкананы ў 1930 г. – групавы партрэт актыва Свята-Пакроўскага сабора ў Гродне, да паступлення ў музей знаходзіўся ў калекцыі вядомага гродзенскага тэатральнага акцёра Мікалая Вагнера (1930–1990) (*фота 1*).

*Фота 1. Актыў Свята-Пакроўскага сабора ў Гродне. 1930 г. Фотапапера, Фотадрук чорна-белы, шкло, рама драўляная.*



Фатаграфія знаходзіцца ў паспарту і раме пад шклом, выканана на фотапаперы, друк чорна-белы, маюцца невялікія забруджанні і драпіны. На здымку – выявы 11 мужчынаў, пяць з якіх сядзяць і шэсць – стаяць за імі [1]. У цэнтры ў крэсле – архіепіскап Алексій (Грамадскі) (1882–1943), злева ад яго – невядомы

святар, свецкія ж асобы апрануты ў касцюмы і таксама іх асобы яшчэ трэба ўстанавіць. Прадмет экспануецца ў 2022 г. на часовай выставе “Нябачнае захаванае” у ГДМГР.

Аляксандр Якубавіч Грамадскі нарадзіўся ў сям’і сельскага псаломшчыка ў вёсцы Дакудаў на гістарычным Падляшшы (зараз у Люблінскім ваяводстве Польшчы). У 1904 г. скончыў Холмскую духоўную семінарыю, у 1908 г. – Кіеўскую духоўную акадэмію са ступенню кандыдата багаслоўя. У 1908 г. ён атрымаў святарскае пасвячэнне, служыў у саборы Холма (сучасны Хелм), уваходзіў у склад Холмскай духоўнай кансісторыі. У 1917–1918 гг. служыў у Бесарабіі, у 1918–1922 гг. працаваў у Крамянецкай духоўнай семінарыі, у 1921–1923 г. быў яе рэктарам. 11 лютага 1922 г. прыняў манаскі пострыг пад імем Алексій, а 3 верасня 1922 г. стаў епіскапам Луцкім, вікарыем Валынскай епархіі. 12 кастрычніка 1922 г. быў прызначаны епіскапам Гродзенскім, з 21 красавіка 1923 г. – епіскап Гродзенскі і Навагрудскі, з 1 снежня 1924 г. – намеснік старшыні Мітрапаліцкага савета Польскай праваслаўнай царквы. З 3 ліпеня 1928 г. – архіепіскап, з 15 красавіка 1934 г. быў пераведзены на пасаду архіепіскапа Валынскага і Крамянецкага.

Архіепіскап Алексій быў актыўным прыхільнікам украінізацыі царкоўнага жыцця Валынскай епархіі. У 1939 г. быў арыштаваны савецкімі ўладамі, але неўзабаве звольнены. У 1940 перайшоў у юрысдыкцыю Рускай праваслаўнай царквы і заставаўся на сваёй пасадзе. У ліпені 1941 г. ён прымаў удзел у саборы епіскапаў у Успенскай лаўры ў Пачаеве, дзе была абвешчана аўтаномная Украінская праваслаўная царква, а архіепіскап Алексій быў абвешчаны мітрапалітам Валынскім і Жытомірскім, экзархам усёй Украіны [2].

У гэты перыяд назіраўся канфлікт паміж рознымі праваслаўнымі царкоўнымі юрысдыкцыямі на акупаванай тэрыторыі Украіны. 7 мая 1943 г. аўтамабіль з мітрапалітам Алексіем быў растраляны ўзброенымі фарміраваннямі УПА (мельнікаўцаў) па дарозе з Крамянца ў Дубна каля станцыі Смыга. Разам з ім на месцы загінулі прратаіерэй Фёдар Юркевіч, перакладчык Марк Жыхараў і кіроўца Аляксандр Мельнічук [3, с. 167; 4, с. 83]. Існуе некалькі версій здарэння: гэтае забойства магло быць арганізавана канкуруючымі царкоўнымі структурамі, магло мець выпадковы характар (планавалася забойства іншых асоб), а таксама арганізавана нямецкімі ўладамі з мэтай недапушчэння аб’яднання царкоўных юрысдыкцый [4, с. 84]. Архіепіскап Алексій – аўтар шматлікіх прац па тэалогіі і царкоўнай гісторыі, шмат зрабіў для развіцця кнігавыдавецтва і царкоўнай журналістыкі.

Другая фатаграфія – гэта партрэт святара Ананія Сагайдакоўскага (1888–1971), зроблены ў Гродне ў 1938 г. з дароўным надпісам “Доброй прихожанке Надежде Булаш на молитвенную память. Протоирей Ананий Сагайдаковский. 28.12.1938” (*фота 2*). Фотадрук чорна-белы, на паперы, стан захаванасці добры [5].

Таксама з гэтым прадметам звязаны і трэці фотаздымак. На ім – на першым плане звон і постаць Ананія Сагайдакоўскага, а на другім – група людзей, з якіх бачныя толькі двое мужчынаў (*фота 3*). Фатаграфія была выканана ў Гродне ў 1936 г. Фотадрук чорна-белы, на паперы, стан захаванасці добры, плямы [6].

***Фота 2. Айцец Ананій Сагайдакоўскі. 1938 г. Фотапапера, фотадрук чорна-белы.***



***Фота 3. Айцец Ананій Сагайдакоўскі з групай прыхажанаў. 1936 г. Фотапапера, фотадрук чорна-белы.***



Ананій Сагайдакоўскі нарадзіўся ў вёсцы Сядліска Замойскага павета (тады ў межах Холмскай епархіі, зараз у Люблінскім ваяводстве Польшчы). Ён скончыў Валынскую духоўную семінарыю, а ў 1915 г. – Казанскую духоўную акадэмію са ступенню кандыдата багаслоўя. У 1923–1929 гг. быў настаяцелем аднаго з храмаў Луцка, актыўна падтрымліваў украінізацыю царкоўнага жыцця, пазней служыў ваенным капеланам, некаторы час у саборы св. Марыі Магдаліны на варшаўскай Празе. З 1 верасня 1934 да 12 снежня 1938 г. святар быў настаяцелем Свята-Пакроўскага сабора ў Гродне. А. Сагайдакоўскі быў адным з найбольш актыўных прадстаўнікоў духавенства таго перыяду, спрыяў дзейнасці Сафійскага праваслаўнага брацтва, вёў актыўную катэхізацыю, стварыў нядзельную школу, супраціўляўся спробам паланізацыі царквы, быў дзеячам украінскага таварыства [7, с. 342–343]. Дзякуючы яго намаганням на сабраныя прыхаджанамі сродкі быў куплены новы звон, адліты на заводзе братоў Фельчынскіх ў Перамышлі (Пшэмысле) які важыў 100 пудоў і каштаваў 7 500 злотых [8, с. 54]. Менавіта гэты звон паказаны на трэцім здымку.

На Пасху 1938 г. свецкія ўлады спрабавалі пазбавіць яго месца ў Гродне, але гэта сустрэла пратэст вернікаў. Аднак ў снежні 1938 г. святара перавялі на Валынь. Падчас нацысцкай акупацыі А. Сагайдакоўскі служыў у Хрубешаве, а пасля 1944 г. выехаў у Аўстрыю, перайшоў у юрысдыкцыю Украінскай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы. Пазней ён выехаў у ЗША, дзе служыў у прыходах УАПЦ у Нью-Ёрку [7, с. 343].

***Фота 4. Епіскап Варсанофій (Грыневіч). 1946 г.***
***Фотапапера, фотадрук чорна-белы.***



На чацвёртым здымку – выява ў поўны рост архіепіскапа Варсанофія (Грыневіча) (1875–1958), выкананая ў Гродне ў 1946 г. (*фота 4*). Фотадрук чорна-белы, на паперы, стан захаванасці добры [9].

Канстанцін Дзіямідавіч Грыневіч нарадзіўся ў Катыні Смаленскага павета Смаленскай губерні (зараз – Смаленская вобласць Расіі). У 1898 г. ён скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю, а ў 1902 г. – Казанскую духоўную акадэмію са ступенню кандыдата багаслоўя. У 1920 г. атрымаў святарскае пасвячэнне і служыў у вёсцы Шарыбы Горацкага павета. У 1927 г. быў арыштаваны, вызвалены ў 1931 г. З 1932 да 1945 г. служыў у розных прыходах Маскоўскай вобласці, у 1945 г. – у Маскве. 14 снежня 1945 г. прыняў манаскі пострыг, а 30 снежня стаў епіскапам Гродзенскім і Баранавіцкім (з 1948 г. – Гродзенскім і Лідскім) [10, с. 8–9]. Епіскап Варсанофій актыўна займаўся аднаўленнем епархіяльнага жыцця, арганізаваў багаслоўска-пастырскія курсы (у 1947 г. яны былі рэарганізаваны ў Мінскую духоўную семінарыю ў Жыровічах), актыўна наведваў прыходы епархіі, спрабаваў аднавіць дзейнасць царкоўнага братства пры Свята-Пакроўскім саборы, праводзіў іншыя арганізацыйныя мерапрыемствы. У 1948 г. ён атрымаў дазвол на правядзенне хроснай хады на Нёман на свята Вадохрышча ў Гродне, у якім прынялі ўдзел каля 5 тысяч чалавек. Аднак пад канец яго служэння ў Гродзенскай епархіі значная частка духавенства супраціўлялася ягонай палітыцы, асабліва ў фінансавых пытаннях [10, с. 16–19]. 18 снежня 1949 г. епіскап Варсанофій быў пераведзены на Сяміпаляцінскую і Паўладарскую кафедру, а 31 кастрычніка 1950 г. стаў епіскапам Чкалаўскім і Бузулукскім. 29 ліпеня 1954 г. ён быў прызначаны епіскапам Калінінскім і Кашынскім, часова таксама кіраваў Вялікалукскай епархіяй, 8 лютага 1956 г. ён атрымаў сан архіепіскапа. Было выдадзена некалькі яго пропаведзяў і зваротаў, у тым ліку ў час служэння ў Гродне [10, с. 9–10].

На пятым здымку – постаці епіскапа Гродзенскага і Лідскага Варсанофія (у цэнтры), пратаірэя Паўла Канстанцінавіча Валынцэвіча (1875–1962) (злева) і яго сына пратаірэя Сяргея Паўлавіча Валынцэвіча (1904–1975) (справа) (*фота* 5). Фотадрук чорна-белы, на паперы, стан захаванасці добры, здымак выкананы ў 1947 г. у Гродне [11]. Цалкам магчыма, што вышэй згаданы партрэт епіскапа Варсанофія быў выкананы Паўлам ці Сяргеем Валынцэвічам.

***Фота 5. Епіскап Варсанофій (Грыневіч), пратаірэй Павел Канстанцінавіч Валынцэвіч, пратаірэй Сяргей Паўлавіч Валынцэвіч. 1947 г. Фотапапера, фотадрук чорна-белы.***



Павел Канстанцінавіч Валынцэвіч нарадзіўся ў Вялікай Бераставіцы Гродзенскага павета. У 1897 г. скончыў Літоўскую духоўную семінарыю ў Вільні, да 1899 г. служыў псаломшчыкам ў весцы Мастаўляны Беластоцкага павета, а 25 мая 1899 г. атрымаў святарскае пасвячэнне. У 1899–1902 гг. – служыў у прыходзе ў вёсцы Касута Вілейскага павета, у 1902–1904 гг. – інспектарам царкоўнапрыходскіх школ Дзісненскага павета, а ў 1904–1947 г. – настаяцелем у весцы Узмёны (зараз Мёрскі раён Віцебскай вобласці). У пазнейшы час служыў у Крэве, Сабакінцах (цяпер – Першамайскае Шчучынскага раёна), Шарашове Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці. Апошні гады пражываў у сям'і сына ў Ваўкавыску. З канца XIX ст. святар зацікавіўся фатаграфаваннем і актыўна ім займаўся, у 1900 г. купіў свой першы фотаапарат. На пачатку XXI ст. унікальны архіў шкляных негатываў Паўла Валынцэвіча быў знойдзены і значная частка здымкаў была алічбаваная і некалькі разоў дэманстравалася на выставах у Беларусі і Літве [12].

Сяргей Паўлавіч Валынцэвіч нарадзіўся ў Узмёнах, служыў праваслаўным святаром на заходнебеларускіх землях, у 1934 г. быў прызначаны членам камісіі па перакладзе царкоўнай літаратуры на беларускую мову. Пасля Вялікай Айчыннай вайны ён служыў у Сабакінцах, быў адказным за правядзенне багаслоўска-пастырскіх курсаў, якія былі арганізаваны ў 1946 г. епіскапам Варсанофіем. У 1948–1952 г. кіраваў Шчучынскім благачыннем, пазней – Ваўкавыска-Поразаўскім, памёр у сане пратаіерэя ў Ваўкавыску. Па сведчаннях сучаснікаў меў вялікі талент прапаведніка.

Фатаграфіі з'яўляюцца цікавай крыніцай па гісторыі праваслаўя і патрабуюць шматбаковага і дакладнага даследвання. З іх дапамогай можна не толькі рэканструяваць асобныя падзеі, але таксама паглыбіць веданне побыту, архітэктуры, прыкладнога мастацтва і біяграфій розных асобаў.

## Спіс крыніц і літаратуры

1. Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі (ГДМГР). – Навуковы пашпарт КП 3923.

2. Доклад архиепископа Гродненского и Волковысского Антония на пленарном заседании международной научной конференции “Святло зямлі гарадзенскай”. 20.10.2022. – Рэжым доступу : https://orthos.org/novosti/privetstvie-arkhiepiskopa-antoniya-uchastnikam-mezhdunarodnoi-nauchnoi-konferenfii/. – Дата доступу : 26.10.2022.

3. Дорош, Н. И. Православный Гродно. Сборник очерков, фотографий, воспоминаний, духовного наследия, архивных документов об истории Гродненской епархии / Н. И. Дорош. – Гродно, 2000. – 266 с.

4. Гордієнко, В. Убивство митрополита Олексія Громадського / В. Гордієнко // Вісник Київського національного університету ім. Т. Шевченка. Істория. – 2007. – № 91–93. – С. 82–84.

5. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 18691.

6. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 14637/32.

7. Кояло, И. Настоятели Свято-Покровского собора г. Гродно во времена Второй Речи Посполитой (1921–1939 гг.) / И. Кояло // I Чтения памяти протоиерея Иоанна Григоровича (1792–1852) : историка, археографа, археолога : Материалы научно-практической конференции, Минск, Минская духовная академия, 17 мая 2017 года. – Минск : Из-во Минской духовной академии, 2018. – С. 336–345.

8. Шатько, Е. Г. Колокола православных храмов Западной Беларуси: страницы истории / Е. Г. Шатько // Минские епархиальные ведомости. – 2013. – № 4. – С. 49–54.

9. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 28043.

10. Зубко, В. А. Церковная жизнь на территории современной Гродненской епархии в 1945–1991 гг. / В. А. Зубко. – Гродно : Изд. отдел Гродненской епархии, 2013. – 125 с., ил.

11. ГДМГР. – Навуковы пашпарт КП 20314.

12. Лушчык, С. Зямляк-фоталетапісец Павел Валынцэвіч / С. Лушчык // Бераставіцкая газета. 18.02.2011. – Рэжым доступу : http://www.beresta.by/зямляк-фоталетапісец-павел-валынцэв/. – Дата доступу : 26.10.2022.